Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №5(68), 2011

*УДК 94(470)“1917/1918”:323.17(470:477)*

# Пачатак савецкай нацыянальнай палітыкі: украінскі рубеж

Р. Р. Лазько

Рассматривается политика Советской России в отношении Украины в первые месяцы советской власти. Автор приходит к выводу, что Украина послужила полигоном для выработки методов политики, направленной на фактическое подчинение Россией национальных окраин при их формальной независимости как советских республик.
**Ключевые слова:** Советская Россия, 1917 год, политика, Украинская Народная Республика, Советская Украина.

Soviet Russia policy towards Ukraine during the first months of the Soviet Power is considered in the article. The author comes to the conclusion that Ukraine served as a testing area for working out political methods aimed at the actual subordination of Ukrainian outlying districts being formally independent as Soviet republics to Russia.
**Keywords:** Soviet Russia, politics, the Ukrainian People's Republic, Soviet Ukraine.

Украіна была адным з тых раёнаў былой Расійскай імперыі, дзе рэчаіснасць прымусіла бальшавіцкі ўрад з першых дзён яго існавання перайсці ад лозунгаў да справы ў нацыянальнай палітыцы. Асноўным кампанентам гэтай рэчаіснасці было хуткае фарміраванне тэндэнцыі да страты Расіяй Украіны на аснове рэалізацыі ёю права народаў на самавызначэнне – ідэі, адкрытымі прыхільнікамі якой заўсёды былі бальшавікі. Даследаванне нацыянальнай палітыкі расійскага бальшавіцкага ўрада на ўкраінскім геапалітычным полі ў першыя месяцы савецкай ўлады стварае выдатную магчымасць выявіць адпаведнасць гэтай ідэі як прапагандысцкага лозунга рэальным мэтам нацыянальнай палітыкі бальшавікоў, прасачыць фарміраванне яе механізма і нават заўважыць непасрэдныя паралелі з іх палітыкай адносна Беларусі.

Украіна – гэта вялізная ва ўсіх адносінах частка Расійскай дзяржавы, дзе знаходзіўся шэраг яе важных эканамічных раёнаў, яе выхад да паўднёвых мораў, стратэгічныя граніцы. Галоднай і халоднай зімой 1917–1918 гг. немагчыма было абыйсціся без украінскага хлеба і вугалю. Кантроль над Украінай меў і вялікае палітычнае значэнне, з’яўляючыся крытэрыем здольнасці бальшавікоў падпарадкаваць сабе Расію ў цэлым і пашыраць яе ўплывы за этнічна рускія межы, хоць бы і пад сцягам сусветнай рэвалюцыі. Па ўсіх гэтых прычынах бальшавіцкаму ўраду нельга было страціць Украіну. А сітуацыя вяла якраз у гэтым накірунку. Абвясціўшы 7(20) лістапада Украіну самастойнай народнай рэспублікай (УНР), украінская Цэнтральная Рада паспяхова стварала атрыбуты нацыянальнай дзяржаўнасці. Яна ўжо далёка прайшла па шляху стварэння адной з апор гэтай дзяржаўнасці – нацыянальнага войска*, 16 лістапада прыняла закон аб выбарах ва Украінскі ўстаноўчы сход на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні [12, с. 223]. Інакш гаворачы, яна поўным ходам рэалізавала лозунг аб нацыянальным самавызначэнні. Пры гэтым украінскія лідары не адмовіліся ад ідэі федэрацыі ўсіх дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, настойваючы, аднак, на тым, што кіраваць ёю мусіць федэратыўны орган, які будзе абапірацца на ўсе сацыялістычныя партыі, існаваўшыя на гэтых тэрыторыях. 23 лістапада Генеральны сакратарыят (урад) УНР звярнуўся да існаваўшых рэгіянальных урадаў і Саўнаркама Расіі з прапановай пачаць у Кіеве перагаворы аб стварэнні на гэтай аснове ўрада федэратыўнай Расійскай рэспублікі [15, с. 136]. Трэба прызнаць, што, з фармальнага пункта гледжання, гэтым зваротам была дапушчана грубая нетактычнасць, бо цэнтральны Расійскі ўрад быў

* Якое, праўда, як паказалі блізкія падзеі, было ненадзейным, бо стваралася, у асноўным, шляхам “украінізацыі” стомленых вайной часцей старой рускай арміі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пастаўлены на адзін узровень з нядаўна ўзнікшымі рэгіянальнымі ўрадамі. Аднак прапанова не магла быць прынятая ленінскім урадам па іншай, прынцыповай прычыне: бальшавіцкае кіраўніцтва толькі што адкінула ідэю аб кааліцыі сацыялістычных партый пры фарміраванні савецкага ўрада ў Петраградзе. Прыняць гэту ідэю як палітычную аснову федэрацыі яно не магло, бо гэты крок дэзавуіраваў бы яго палітыку. Не магло яно прыняць яе і таму, што не ўпэўнена было ў сваёй здольнасці кантраляваць федэратыўныя органы. Такім чынам, як прызнаваў Сталін, гэта было пытанне аб уладзе [12, с. 7–8], ды не толькі на Украіне, але і ва ўсёй Расійскай федэрацыі, калі б дайшло да яе стварэння. Так узнік канфлікт, ад вырашэння якога залежаў лёс будучай федэрацыі – не толькі яе форма, але і яе рэальны палітычны змест.

Зразумела, савецка-ўкраінскі канфлікт нельга зводзіць да дзвюх названых найбольш істотных яго прычын. Побач дзейнічалі іншыя, але яны былі малаістотнымі або наогул надуманымі, як, напрыклад, папрокі ў адрас Рады ў дэзарганізацыі фронта з-за адклікання ёю на Украіну украінізаваных часцей. Больш дэзарганізаваць фронт, чым гэта рабілі самі бальшавікі, было немагчыма. Праўда, аднак, што Саўнаркам некаторы час стрымліваў гэты канфлікт, рабіў нават добразычлівыя жэсты ў адносінах Украіны накшталт рашэння аб вяртанні з Петраграда ў Кіеў украінскіх гістарычных рэліквій. Такая пазіцыя была выклікана ўсведамленнем слабасці ўплываў бальшавіцкай партыі на Украіне, за выключэннем некалькіх усходніх і паўднёва-ўсходніх раёнаў. Гэта паказалі вынікі выбараў у расійскі Устаноўчы сход, прайшоўшыя 12 лістапада. У цэлым па Украіне РСДРП(б) атрымала на гэтых выбарах толькі 10% галасоў, у той час як мясцовыя сацыялістычныя партыі, якія аб’ядноўваліся Радай, – 75% [15, с. 69]. Рада ў шэрагу раёнаў рэальна ажыццяўляла ўладу, у тым ліку ў Кіеве, і не саступала яе саветам. У такой сітуацыі ЦК РСДРП(б) вырашыў дзейнічаць “ціхай сапай”, імкнучыся “растварыць” арганізацыі Рады ў саветах (выраз запазычаны намі ў І.В. Міхуцінай – гл. [14, с. 81]. Відавочна, гэта тактыка абапіралася на ўдалы вопыт дзейнасці РСДРП(б) у аб’яднаных (з меншавікамі) партыйных арганізацыях і ў саветах вясной – летам 1917 г.). Рашэнне аб прымяненні гэтай тактыкі, відавочна, было прынята ЦК 17 лістапада і знайшло адлюстраванне ў размове Сталіна па прамым провадзе з членам Генеральнага сакратарыята УНР Н.В. Поршам. У ёй удзельнічаў і член Кіеўскага камітэта РСДРП(б) С. Бакінскі. Сталін напомніў, што пазіцыя РСДРП(б) па нацыянальным пытанні была вызначана Красавіцкай партыйнай канферэнцыяй, якая прызнала за нацыямі права на аддзяленне і стварэнне самастойных дзяржаў. А цяпер Саўнаркам быў гатовы пайсці далей і падтрымаць ідэю Расійскай федэратыўнай рэспублікі, калі б за яе выказаўся Украінскі нацыянальны сход. Ен тут жа дадаў, што “ўлада ў краі, як і ў іншых абласцях (па-за Украінай – Р.Л.) павінна быць у руках усёй сумы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, уключаючы сюды і арганізацыі Рады” [14, с. 52]. Гэта азначала, што Саўнаркам згадзіўся б на федэрацыю з такой Украінай, у якой прабальшавіцкія саветы былі б дапушчаны да ўлады. Бакінскаму Сталін перадаў даручэнне ЦК РСДРП(б) узяцца за скліканне з’езда “прадстаўнікоў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Украіны… зразумела, сумесна з Радай”. Калі ж Рада адмовілася б, то неабходна было склікаць яго і без Рады [2, с. 537–538]. Як відаць з кантэкста размовы і наступных дзеянняў бальшавікоў Паўднёва-Заходняга краю (іх абласная арганізацыя з цэнтрам у Кіеве), у гэтым выпадку Саўнаркам быў гатовы разглядаць гэты з’езд як Устаноўчы сход Украіны, з якім належала мець справу. У Петраградзе спадзяваліся, што гэтаму з’езду ўдасца перахапіць уладу ў УНР.

Выконваючы даручэнне ЦК партыі, украінскія бальшавіцкія арганізацыі разгарнулі падрыхтоўку агульнаўкраінскага з’езда дэпутатаў і прызначылі яго на 4 снежня. Каб мець поўную гарантыю свайго поспеху на з’ездзе, за некалькі дзён да яго адкрыцця кіеўскі камітэт РСДРП(б) па прапанове Л. Пятакова вырашыў выставіць Радзе ультыматум з патрабаваннем саступіць уладу бальшавіцкаму Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту, а ў выпадку яе адмовы – скінуць Раду ўзброенай сілай. Аднак Рада апярэдзіла бальшавікоў, правяла арышты іх лідэраў і раззброіла значную частку прыхільных ім рэвалюцыйных войск [15, с. 153]. У наступныя дні Рада не пакінула бальшавікам ніякіх шансаў пры абранні дэпутатаў з’езда саветаў, зусім не цырымонячыся пры гэтым з працэдурай. Іх прадстаўнікі не былі нават дапушчаны ў прэзідыум з’езда [14, с. 81].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ленінскі Саўнаркам кінуўся дапамагаць сваім украінскім таварышам. 3 снежня, напярэдадні адкрыцця з'езда, ім быў прыняты "Маніфест Савета народных камісараў да ўкраінскага народа з ультыматыўным патрабаваннем да Украінскай Рады", напісаны Леніным з удзелам Троцкага і Сталіна. У гэтым маніфесце, з аднаго боку, СНК прызнаў "Украінскую Народную Рэспубліку, яе права зусім аддзяліцца ад Расіі або ўступіць у дагавор з Расійскай Рэспублікай аб федэратыўных і да таго падобных узаемаадносінах паміж імі". Прызнаў менавіта існаваўшую Украінскую Народную Рэспубліку, рэспубліку Цэнтральнай Рады, бо іншай і не існавала [14, с. 59; 11, с. 8; 10, с. 100]. Факт характэрны. Ён сведчыць аб тым, наколькі шырока быў гатовы манеўраваць ленінскі ўрад, каб пакінуць для сябе канал уплыву на Украіну. Прызнанне УНР мусіла давесці ўкраінскім сялянам, інтэлігенцыі, што СНК выступае не супраць самастойнай Украінскай рэспублікі, ён выступае толькі супраць формы ўлады, якая там склалася. І гэта быў другі бок маніфеста. У ім Рада была абвінавачана ў правядзенні "двухсэнсоўнай буржуазнай палітыкі", якая змусіць Саўнаркам аб'явіць "без усялякіх ваганняў вайну ёй" [8, с. 144], калі яна на працягу 48 гадзін не прыме наступныя патрабаванні: адмовіцца здымаць украінізаваныя часці войск з фронта; перастане прапускаць праз сваю тэрыторыю казацкія часці на Дон, на Урал; будзе садзейнічаць барацьбе з контррэвалюцыяй на Доне; перастане раззбройваць савецкія часці на Украіне [8, с. 145]. 4 снежня ультыматум быў накіраваны Радзе. На наступны дзень Саўнаркам разгледзеў адказ на яго, прызнаў яго нездавальняючым і вырашыў, што Рада знаходзіцца ў стане вайны з Савецкай Расіяй [15, с. 160]. У гэты ж дзень Саўнаркам прызначыў Ул. Антонава-Аўсеенку арганізатарам узброенай барацьбы супраць Рады [4, с. 14].

Аднак з тактычнага гледжання ўзнікшая сітуацыя была не настолькі адназначнай, каб Саўнаркам адважыўся адкрыта ініцыіраваць развязванне вайны з Украінскай Народнай Рэспублікай. Яму пагражала небяспека апынуцца ў нявыгаднай для яго ролі душыцеля самавызначэння ўкраінскага народа. Улады УНР, са свайго боку, не жадалі вайны, таму адправіўшы Саўнаркаму цвёрды адказ на яго ультыматум, яны прынялі захады, каб загладзіць канфлікт шляхам перагавораў. Іх даручана было весці Украінскаму рэвалюцыйнаму штабу Петраградскай краёвой вайсковай рады [3, с. 117]. У святле кампраміснай пазіцыі УНР было відавочна, што Расіі не ўдалося пазбегнуць палітычна нявыгаднай для яе сітуацыі. Сталін прызнаваў у друку, што атрымліваў у тыя дні "мноства рэзалюцый і лістоў" ад украінцаў [6, 13 дек.; 12, с. 6], аўтары якіх патрабавалі ад яго тлумачэнняў дзеянняў Савецкай Расіі. На працягу снежня наркаму па справах нацыянальнасцей давялося неаднойчы публічна – у друку і на пасяджэнні УЦВК – ад імя ўрада апраўдвацца перад абвінавачаннямі ў тым, што канфлікт узнік на грунце барацьбы ўкраінскага народа за самавызначэнне. "Гэта няправільна, – казаў Сталін на пасяджэнні УЦВК 14 снежня. – Рада прапануе ўстанавіць у Расіі федэратыўны лад. А Савет Народных камісараў ідзе далей Рады, аж да аддзялення" [12, с. 15–16]. Такім чынам, бальшавіцкі ўрад прадстаўляў сябе ў ролі ўстановы, якая жадае ўкраінскаму народу большай палітычнай свабоды, чым ён сам быў гатовы ўзяць.

На самай жа справе выйсце з гэтай далікатнай сітуацыі да таго часу было ўжо знойдзена. Яно заключалася ў расколе Украіны шляхам стварэння яе савецкага – бальшавіцкага – антыпода і ўзброенага падаўлення радаўскай нацыянальнай Украіны пад сцягам гэтай бальшавіцкай, прарасійскай Украіны.

Відавочна, гэта задача была ўсвядомлена не пазней 4 снежня, калі стала ясна, што ўкраінскім бальшавікам не ўдалося падпарадкаваць сабе агульнаўкраінскі з'езд дэпутатаў рад (саветаў), каб пачаць "растварэнне" арганізацый Рады ў саветах. Бальшавікі пакінулі гэты з'езд і перабраліся на ўсход, у Харкаў, дзе разам з дэлегатамі пралетарскай і адначасова прарасійскай Крываражска-Данецкай вобласці правялі асобны з'езд, на якім аб'явілі аб пазбаўленні Украінскай Цэнтральнай Рады ўладных правоў і стварэнні новых, савецкіх органаў улады [5, с. 61–64; 2, с. 594]. Харкаўскі і расійскі савецкія ўрады 13–16 снежня абмяняліся прывітаннямі. Заўважым, што фармальнага прызнання Савецкай Украіны з боку ленінскага ўрада не спатрэбілася, на яе было перанесена прызнанне УНР, афармленае ў маніфесце 4 снежня.

Стварэнне ўкраінскага савецкага ўрада дало бальшавіцкаму ўраду Расіі палітычны грунт для ўжо пачатай ім барацьбы за фактычнае падпарадкаванне Украіны ўзброенай сілай.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

З Масквы, Петраграда, Беларусі ў накірунку Харкава пачалі сцягвацца падначаленыя Антонаву-Аўсеенку сілы. Спачатку яны былі невялікія і па сваёй якасці мала прыгодныя для энергічных наступальных дзеянняў. Антонаў-Аўсеенка ў сакрэтных данясеннях Леніну падрабязна дакладваў, як дабіваўся павышэння іх баяздольнасці [1, с. 26–29, 30–32]. Аднак слабасць ваенных сіл не стала галоўнай перашкодай на шляху падпарадкавання Украіны. Галоўная праблема знаходзілася ў палітычнай сферы – менавіта ў тым, каб прадставіць развязаную супраць Украіны вайну ў якасці барацьбы ўкраінскага народа супраць буржуазнай Украінскай Рады. Дзеля гэтага давялося рашыць некалькі задач: па-першае, прыняць ідэю Украіны з тым яе тэрытарыяльным зместам, які адстойвала УЦР, гэта значыць, якая ўключала не толькі 5 губерняў Цэнтральнай Украіны, але і 4 паўднёва-ўсходнія губерні. Ленін быў першым з бальшавікоў, хто засвоіў гэту ідэю, але ўвесці яе ў свядомасць яго ўкраінскіх таварышаў, асабліва з усходніх губерняў, было нялёгкай справай. “Для большасці членаў нашай партыі, – пісаў пазней М. Скрыпнік, адзін з лідараў украінскіх бальшавікоў, – Украіна як нацыянальная адзінка не існавала. Была Маларасія, неразрыўная частка адзінай непадзельнай Расіі…” [11, с. 291]. За гэтым прыватным, на першы погляд, пытаннем аб тэрытарыяльным змесце паняцця “Украіна” стаяла праблема карэннага значэння, здольная вызначыць поспех барацьбы за Украіну – задача “укранізацыі” бальшавіцкіх арганізацый Украіны, набыцця імі здольнасці выступаць у якасці ўкраінскай палітычнай сілы, каб супрацьстаяць у гэтай ролі левым украінскім партыям, аб’яднаным вакол УЦР. Гэта задача ўскладнялася неабходнасцю рашаць яе такім чынам, каб не дапусціць аслаблення кантролю з боку петраградскага (потым маскоўскага) Цэнтра над украінскімі бальшавікамі. Рашэнне было знойдзена ў тым, каб даць фармальна самастойнай Сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі Украіны правы “мясцовай, абласной – па сутнасці справы” арганізацыі РСДРП(б), падпарадкаванай яе ЦК і Статуту [9, с. 125; гл. таксама 13, с. 223–224]. Гэта многааспектная задача аказалася настолькі няпростай, што да яе практычнага рашэння ўкраінскія бальшавікі прыступілі толькі вясной 1918 г., калі з’явіўся новы магутны фактар, які пачаў штурхаць іх у адпаведным накірунку – германская акупацыя Украіны. Падпісаўшы ў Брэсце мірны дагавор з Германіяй, Савецкая Расія не магла весці з ёю адкрытую барацьбу, тым больш на Украіне, незалежнасць якой прызнала ў снежні 1917 г. Неабходнасць для Савецкай Расіі палітычнай шырмы, якая б прыкрывала гэту барацьбу, зразумелі нават самыя артадаксальныя бальшавікі з Паўднёва-Усходняй Украіны. Такой шырмай і стала Савецкая Украіна з фіктыўна самастойнай правячай у ёй украінскай камуністычнай партыяй.

Але да таго часу, як барацьба супраць акупантаў завяршылася ачышчэннем Украіны ад германскіх войск, амаль на працягу года Савецкая Расія вымушана была праводзіць палітыку дзвюх Украін: уступіла ў перагаворы з УЦР, некаторы час супрацоўнічала з ёю на Брэсцкай мірнай канферэнцыі, наладжвала адносіны, але паралельна вяла барацьбу з гэтай жа Украінай пад сцягам і за спіной Савецкай Украіны. Гэта палітыка адносна Украіны выдатна ілюструе беспрынцыпны характар савецкай нацыянальнай палітыкі, падпарадкаванай задачы ўстанаўлення (або вяртання) улады ў нацыянальных раёнах і перанясення рэвалюцыі на новыя тэрыторыі. Украіна паслужыла палігонам для выпрацоўкі метадаў гэтай палітыкі і набыцця неабходнага вопыту, які іншы раз аўтаматычна пераносіўся ў рэчаіснасць суседняй Беларусі.

**Літаратура**

1 Большевистское руководствово. Переписка. 1912–1927. Сб. документов. – М.: Российская политическая энциклопедия, 1996.

2 Великая Октябрьская социалистическая революция на Украине. Февраль 1917 – апрель 1918. Сб. док. и материалов в 3 т. Т. 2: октябрь – декабрь 1917. – Киев: Госполитиздат Украины, 1957.

3 Владимир Ильич Ленин. Биографическая хроника. – Т. 5: Октябрь 1917 – июль 1918. – М.: Изд-во политической литературы, 1974.

4 Директивы Главного командования Красной Армии. – М.: Воениздат, 1969.

5 Документы внешней политики СССР. – М.: Гос. изд-во полит. лит-ры, 1957. – Т. 1.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

6 Известия, 1917.
7 Ленин, В.И. Неизвестные документы. 1891–1922. – М.: Росспэн, 1999.
8 Ленин, В.И. Полное собрание сочинений / В.И. Ленин. – Т. 35.
9 Переписка секретариата ЦК РСДРП(б) с местными партийными организациями (ноябрь 1917 – февр. 1918). Сб. документов. – М.: Гос. изд-во полит. лит-ры, 1957.
10 Свердлов, Я.М. Избранные произведения / Я.М. Свердлов. – М.: Госполитиздат, 1959. – Т. 2.
11 Скрипник, М. Статті й промови / М. Скрипник. – Т. 1: Пролетарська революція на Україні. – Харків: Державне вид-во Україні, 1930.
12 Сталин, И.В. Сочинения / И.В. Сталин. – М.: Гос. изд-во полит. лит-ры, 1947. – Т. 4.
13 Кульчицкий, С.В. УССР в 1917–1922 годах: характер и пределы советской национальной государственности / С.В. Кульчицкий // Россия в ХХ веке: Проблемы национальных отношений. – М.: Наука, 1999.
14 Михутина, И.В. Украинский брестский мир / И.В. Михутина. – М.: Изд-во “Европа”, 2007.
15 Політична історія Україны: ХХ століття. – У 6 т. – Т. 2: Революції в Україні: політико-державні моделі та реалії (1917–1920). – Київ: Вид. “Генеза”, 2003.
16 Реэнт, О.П. Українські визвольні змагання 1917–1921 рр. / О.П. Реэнт, О.С. Рубльов. – К.: Видавничий дім “Альтернативи”, 1999.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 11.01.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ